**Казлова А.М.**, студ. гр. 314 БДУКМ
Навук. кір. – Булынёнак Л.В., выкладчык

# КАНЦЭПТУАЛЬНАЕ МАСТАЦТВА: ВОБРАЗ ДУМКІ МАСТАКА

Асновы канцэптуальнага мастацтва былі закладзены ў сярэдзіне ХХ стагоддзя і працягваюць адыгрываць вядучую ролю ў мастацтве XXI стагоддзя. Заклаўшы свае асновы ў далёкім мінулым, канцэптуальнае мастацтва не страціла сваёй актуальнасці ў сучаснасці, таму што канцэптуальнае пасланне мастака заўсёды накіравана ў будучыню. Вялікая колькасць сучасных мастакоў, архітэктараў, музыкантаў працуюць ў гэтым накірунку і рэалізуюць у ім свае творчыя задумы. Канцэптуальнае мастацтва застаецца папулярным сярод вузкага кола спецыялістаў, але цяжка знайсці накірунак гэтак жа непапулярны сярод іншых авангардных рухаў ў шырокай публікі. Магчыма, гледачу складана зразумець усе рэбусы новых плыняў.

Адзін з самых вядомых і дзейных артыстаў сучаснага мастацтва Францыі Бэн Вац’е, абвяшчае: «Мастацтва бескарысна, сыходзь дадому». Гэты лозунг з плаката Вац’е з'яўляецца адным з самых яскрывых прыкладаў канцэптуалізму, прапаноўваючы цалкам новую філасофію мастацтва. Канцэптуальная творчасць задае непасільную задачу для глядацкага ўспрымання – выклікае пэўны дыскамфорт у гледача, галоўным чынам, за кошт іншых правілаў іх уздзеяння. Кантакт з такім мастацтвам прапануе іншы погляд, калі прыстасавацца да яго, глядач зможа зразумець думку мастака і каштоўнасць яго твораў. Каб лепш уявіць сабе, у чым заключаецца галоўная асаблівасць думкі мастака дадзенага кірунку, звернемся да гісторыі.

Своеасаблівыя прадчуванні канцэптуальнага мыслення ці індывідуальныя прыклады канцэптуальнай творчасці можна назіраць у гісторыі авангарднага мастацтва на працягу ўсяго ХХ стагоддзя. Іх можна адзначыць ў мастакоў Марсэля Дзюша, Іва Кляйна, Эндзі Уорхола,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кампазітара Джона Кейджа або ў непасрэдных папярэднікаў канцэптуалізму паэтаў – канкрэтыстаў і мастакоў, музыкантаў, якія ўваходзілі ў 60- я гады ў інтэрнацыянальны гурт «Флюксус» (Fluxus) [1. с. 4]

У якасці першага імпульсу для канцэптуалізму прынята лічыць дадаістычны рух і творчасць Марсэля Дзюшана, дакладней – яго «метад гатовых рэчаў» (ready – made). Ідэі Дзюшана і іх тэарэтычная важнасць для будучыні канцэптуалізма былі пазней ацэнены амерыканскім мастаком Джозэфам Кошутам. У сваім эсэ «Мастацтва пасля філасофіі» Кошут пісаў: «Усе мастацтва (пасля Дзюшана) – канцэптуальна па сваёй прыродзе, таму што мастацтва і існуе толькі ў выглядзе ідэі» («All art is conceptual (in nature) because art only exists conceptually») [4. с. 19] Творы Дзюшана «Фантан» ( пісуар з аўтографам і датай ) і «веласіпеднае кола на зэдліку» з'яўляюцца прамой спасылкай тым, хто шукае самыя характэрныя прыклады канцэптуалізму.

Вялікі ўклад у развіццё новага кірунку ўнеслі англійскія і амерыканскія мастакі. З імёнамі амерыканцаў Джозэфа Кошута, Лоуренса Вейнера, Роберта Бэры, Дугласа Хьюблера, а таксама ангельскай арт-групы «Мастацтва і мова» звязаны ўяўленні аб «класічнай» версіі канцэптуалізму. Характэрная асаблівасць напрамка – замена рэчаіснасці яе вербальнай канцэпцыяй, пераход ад рэчавога да матэрыяльнага ўвасаблення мастацкіх ідэй (канцэптаў), якія могуць быць прадстаўлены ў выглядзе фрагментаў тэкставай і выяўленчай інфармацыі: лічбаў, формул, фота, тэлеграм, надпісаў і схем, якія адлюстроўваюць ідэю мастака. На змену антыінтэлектуалізму мастацкай творчасці папярэдняга перыяду прыйшло мастацтва «ультраканцэптуальнае», якое надае выключнае значэнне мысленню. Надыходзячае дзесяцігоддзе было абвешчана эпохай «мастацтва як ідэі» («Post – Object – Art»). «Знешні выгляд мастацкага твора не так важны, пісаў у артыкуле «Параграф канцэптуальнага мастацтва» мастак Сол Левітт. – Калі яно мае матэрыяльную форму, яно можа выглядаць як заўгодна» [3. с. 5] Дуглас Хьюблер, адзін з вядучых мастакоў -канцэптуалістаў, так тлумачыць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сваю ідэю: «Свет поўны рэчаў больш ці менш цікавых. І я не жадаю дадаваць да іх новыя. Я аддаю перавагу проста паказваць на існуючыя рэчы ў тэрміналогіі часу або прасторы» [1.]

Твор канцэптуальнага мастацтва заўсёды адсылае да таго, што ляжыць за межамі матэрыяльнай формы: да ідэй , да аналізу механізму ўспрымання і разумовай дзейнасці. Важнай формай рэалізацыі канцэптуалізму ў заходнім мастацтве стаў сам спосаб рэпрэзентацыі напрамка. Першай праграмнай экспазіцыяй-маніфестам канцэптуальнага мастацтва многія крытыкі лічаць выставу, якая адбылася ў студзені 1969 у Нью-Ёркскай галерэі С. Сігелауба, у якой прынялі ўдзел Д. Кошут, Д. Хьюблер, Р.Бэры і Л. Вэйнер. «Выстава складаецца з каталога; матэрыяльнае прысутнасць работ – дадатак да каталога» – так пазначыў Сігелауб спецыфіку экспазіцыі [1. с. 8]

Дакументацыя дэманстрацыі часам станавілася адзіным сведчаннем існавання саміх канцэптуальных твораў. Некаторыя выставы не мелі нават канкрэтнага месца знаходжання самой экспазіцыі . Асяроддзе, у якім нярэдка дэманструюцца творы канцэптуалізму пазбаўленая якіх-небудзь мастацкіх формаў. Гэта звязана з устаноўкай на антыкамерцыйную ідэю функцыянавання мастацтва. Нельга прадаць ці купіць «тэлепатычныя твор» Бэры, земляныя работы Смітсана або працы з паветра Андрэ. «Канцэптуальныя мастакі ў большай меры містыкі, чым рацыяналісты, – пісаў Сол Левітт. – Яны пераскокваюць да тых высноў, якія лагічна не могуць быць дасягнуты... алагічнай высновы вядуць да новага вопыту...» [3.]

Велізарнае значэнне для канцэптуальнай эстэтыкі маюць катэгорыі «невядомага», «нявызначанага », «нішто». У адным з сваіх выступаў Роберт Бэры адзначыў: «Я аддаю перавагу мець справу з рэчамі, пра якія мне зусім нічога не вядома. Я спрабую выкарыстоўваць тое, пра што іншыя людзіі не думаюць – пустэчу, якая робіць малюнак ня малюнкам... Проста пустэча. «Нішто» здаецца мне найбольш ўражлівай рэччу ў свеце» [1.] Падобны вобраз думкі характэрны шматлікім канцэптуалістам. У знешняй прастаце твораў яны хаваюць неабсяжную глыбіню філасофскай думкі. Канцэптуалізм

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

склаўся пад непасрэдным уздзеяннем актуальных для таго часу філасофскіх, сацыялагічных і эстэтычных плыняў: філасофія лагічнага пазітывізму, аналітычная філасофія і структуралізм, лінгвістыка і розныя тэорыі інфармацыі. Яны сталі той тэарэтычнай базай, на якую абапіраюцца канцэптуалісты. «Канец філасофіі», абвешчаны ў 60-я гады заходнімі тэарэтыкамі, шмат у чым вызначыў спецыфіку канцэптуальнай творчасці як «постфіласоўскай дзейнасці». «Мастацтва пасля філасофіі», так называе новы напрамак Джозэф Кошут.

Канцэптуальнае мастацтва развіваецца і на Беларусі, нягледзячы на значнае адставанне ад Захаду, са сваімі асаблівасцямі і характэрнымі для беларускага грамадства рысамі. Толькі ў другой палове 1990-х – 2000-х гадах мастацтва Беларусі пачынае запаўняць раней незанятыя прасторы мастацкага поля. З'яўляюцца новыя фестывалі, праводзяцца мастацкія акцыі, перформансы і хэпенінгі. Так, у 1995 годзе гурт мінскіх мастакоў і мастацтвазнаўцаў ў складзе І. Кашкурэвіча, М. Баразны, П. Васілеўскага, В. Зленко, А. Логінава, А. Дарашэвіча правяла ў Віцебску акцыю «АРТУНАДЫСКУС» , прысвечаную УНОВІСу. У тым жа годзе ў Мінску група студэнтаў БДАМ (П.Татарнікаў, А.Басалыга, О.Никішын і інш.) пад кіраўніцтвам М.Баразны праводзіць міжнародную мастацкую акцыю «Пуп Зямлі / Nabel der Welt». У 1997 годзе ў мінскай галерэі «6-я лінія» праходзіць першы тыдзень перформансу. З 1999 года і па гэты дзень у Мінску штогод праводзіцца міжнародны фестываль перформансу «Навинки».

Росквіт галерэйнага руху ў Беларусі прыпаў на 1990–2000-я гады. Незалежныя некамерцыйныя мастацкія галерэі, створаныя па ініцыятыве мастакоў і мастацтвазнаўцаў, сталі альтэрнатыўнай формай звыклай прэзентацыі твораў мастацтва ў музеях і выставачных залах. У галерэях «А. В.», «Верхні горад», «У майстра», «У Пушкіна», «Медэя», «6-я лінія», «Nova», «VILNUS», «Саляныя склады», «Alter ego» асвойваліся новыя формы мастацтва, з'яўляліся нябачаныя раней мастацкія акцыі [6]

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікую ролю ў развіцці актуальнага мастацтва ў наш час грае галерэя «Ў», супрацоўнічаючы з мастакамі і скульптарамі: Р. Вашкевич, С. Грыневіч, М. Гулін , А. Слабодчыкава, К. Селеханаў, П. Вайницкі і С. Ждановіч.

Ва ўсім свеце актуальнае мастацтва падтрымліваецца ўладай, свабодна выстаўляецца ў класічных музеях, каб зацікавіць новую аўдыторыю, разнастаіць мернае музейнае жыццё. У Беларусі канцэптуальныя працы здымаюць з выстаў, грамадства ставіцца недаверліва. З прычыны сваёй кансерватыўнасці, большая частка беларуская публікы жыве стэрэатыпамі і адмаўляецца думаць над сучасным мастацтвам. Успрымаць сучаснае канцэптуальнае мастацтва як каталізатар пераменаў даволі складана, але навучанне – гэта таксама няпроста. Ідэі канцэптуальнага мастацтва здольныя натхняць творчага чалавека у яго дзейнасці. Канцэптуалізм можна разглядаць як крыніцу для пашырэння межаў творчасці. Крызіс – гэта не калі мала грошай, а калі чалавек не здольны па-новаму ставіцца да свету, які змяняецца па-за залежнасці ад яго жадання. Канцэптуальныя ідэі – гэта тыя ідэі, якія здольныя узбурыць прытомнасць і прымусіць рухацца ў новым напрамку, насустрач будучыні.

____________

1. Бобринская, Е.А. Концептуализм / Е.А. Бобринская. – М. : ГАЛАРТ, 1994. – 216 с.

2. Обухова, А.Е., Орлова, М.В. Живопись без границ. От поп-арта к концептуализму : [альбом] / А.Е. Обухова, М.В. Орлова. – М. : ГАЛАРТ, 2001. – 175 с.

3. Левитт, С. Параграфы о концептуальном искусстве : [художественный журнал] / Sol LeWitt. – 2008. – № 69. – 52 с.

4. Koshuth, J. Art after Philosophy and After: Collected Writings. 1966–1990. Ed. G.Guercio. – Cambridge, Mass., 1991. – 135 p.

5. Mart. Современное белорусское искусство [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.mart.by/2009/11/13/neo-pop-art-po-belarusski/. – Дата доступа : 23.03.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. ARTKURATOR [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://artkurator.com/articles/academy.html. – Дата доступа : 23.03.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ